**Самахвалава, В.** «За кожнага сэрца баліць» / В. Самахвалава // Ленінскі сцяг (Лепель). — 1989. — 24 жн. — С. 2.

## «ЗА КОЖНАГА СЭРЦА БАЛІЦЬ»



Непараўнальным болем адгукалася ў сэрцах не толькі родных і блізкіх, але суседзяў і знаёмых, нават чужых, калі ў дом прыходзіла страшная вестка – загінуў пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку…

Гінулі ў Афганістане не толькі ў баях, ад страшных ран, гінулі і ад хвароб і немачы. Гэтаму «спрыялі» самі ўмовы – высакагор'е, неймаверная спякота, недахоп кіслароду і вады..

Хіба думала Г. І. Воюш з вёскі Вялікі Поўсвіж, што яе здаровы 34-гадовы Іван, любімец сям'і, які даслужыўся да маёра, раптоўна памрэ ў Афганістане, напярэдадні свайго чарговага водпуску?

Вялікім было гора маці. Прайшло амаль два гады, а нельга забыць і цяпер той дзень, калі прыйшла страшная вестка. Усёй сям'ёй кінуліся ў Кіеў, куды прывезлі труну. Забілася маці над ёй, ды нельга было ўбачыць сына ў апошні раз.

– Вельмі хацела, каб Ваню прывезлі дамоў і пахавалі на вясковых могілках, –выціраючы слёзы, расказвае маці. – Але нявестка і ўнук прасілі, каб пахавалі яго ў Кіеве. Ім жыць там далей, таму не змагла я супраць пайсці. Так і пахавалі яго на Украіне.

Чацвёра сыноў выхоўвалася ў простай вясковай сям'і Воюшаў. Старэйшыя Васіль і Іван закончылі ваеннае вучылішча, Пётр – сельскагаспадарчую акадэмію. Мікалай таксама пачаў у свой час вучыцца ў акадэміі, потым кінуў і пайшоў служыць у армію. Не было сорамна бацькам за сыноў сваіх, ніхто ў вёсцы дрэннага слова не скажа пра іх. Але так ужо вядзецца – смерць часцей забірае самых лепшых.

– Іван з дзяцінства марыў быць ваенным, – працягвае Ганна Іванаўна. – Таму і пайшоў у Харкаўскае танкавае вучылішча. Потым служыў за мяжой, у апошні час – у Кіеве, выкладаў у вучылішчы. Адтуль яго і накіравалі ў Афганістан. Ён не пісаў нам аб гэтым.

Але чула мацярынскае сэрца, што ён «там», калі атрымала першае пісьмо са зваротным адрасам палявой пошты. Як і любая маці, чые сыны былі «там», Ганна Іванаўна ўвесь час жыла ў асаблівым напружанні. Яна лавіла кожнае слова па радыё і тэлебачанню, калі гаворка ішла пра ваенныя дзеянні ў Афганістане. Усё думала: вернецца сын дадому жывы. Але не дачакалася.

– Год я нікуды не хадзіла, – працягвае маці. – Восенню мяне запрасілі на сустрэчу, дзе сабраліся воіны-інтэрнацыяналісты і сем'і загінуўшых. Але на гэты час у мяне ўжо быў білет да Кіева – на гадавіну з дня гібелі Вані. Потым гадзіннік мне падарылі. Дзякую за гэта. Мне не трэба матэрыяльнай дапамогі. Крыўдна за іншае. Неяк выступаў на сустрэчы з кандыдатам у народныя дэпутаты адзін і гаворыць: чаму «афганцам» і сем'ям загінуўшых такія ж ільготы, як і франтавікам? Яны ж, маўляў, на чужой зямлі ваявалі? Балюча было слухаць такое. Хіба ж яны ў гэтым вінаватыя? Хіба можна падобнае гаварыць пра зусім маладых хлопцаў, якія вярнуліся інвалідамі?

Яны самааддана служылі там, куды іх накіроўвалі. А цяпер ім, скалечаным, вельмі цяжка жыць. У мяне за кожнага, няхай і чужога, сэрца баліць.

**В. Самахвалава**

**На здымку:** І. П. Воюш у час службы ў ДРА. Здымак зроблены за тры месяцы да смерці